# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс (электронная версія) па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” распрацаваны для студэнтаў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры”, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-88 01 01 «Фізічная культура» (па напрамках); 1-88 01 02 «Аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура» (па напрамках); 1-88 01 03 «Фізічная рэабілітацыя і эргатэрапія» (па напрамках); 1-88 02 01 «Спартыўна-педагагічная дзейнасць» (па напрамках); 1-89 02 01 «Спартыўна-турыстычная дзейнасць» (па напрамках), і ўключае тэарэтычны і практычны матэрыял.

**Мэты ВМК (электронная версія) па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”:**

- развіць вуснае і пісьмовае маўленне студэнтаў, здольнасць самастойна назіраць і даследаваць моўныя з’явы;
- фарміраванне навыкаў у галіне дзелавых зносін;
- лагічна выказваць свае думкі;
- узбагачэнне лексічнага запасу ў галіне беларускамоўнай спартыўнай тэрміналогіі, пашырэнне яго ў сферы прафесійнай (спартыўна-педагагічнай) дзейнасці.

**Задачы вывучэння ВМК (электронная версія) па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”:**

- паказаць ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;
- раскрыць функцыі беларускай мовы як вызначальнага кампанента нацыянальнай культуры;
- развіць і ўмацаваць навыкі практычнага выкарыстання вуснай і пісьмовай форм сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- сфарміраваць у студэнтаў разуменне неабходнасці ведаць і карыстацца беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці;
- даць студэнтам неабходную сістэму ведаў аб лексічным складзе, тэрміналогіі і маўленчай культуры;
- спрыяць паглыбленаму асэнсаванню і засваенню тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі на беларускай мове па абранай спецыяльнасці;
- даць веды аб тэрміналагічных слоўніках і даведніках па адпаведных сферах прафесійнай дзейнасці;
- авалодаць навыкамі перакладу і рэферыравання прафесійна арыентаваных тэкстаў;
- сфарміраваць уменне складаць і весці на беларускай мове справавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публічныя выступленні;
- садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

**ВМК (электронная версія) па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”** уключае наступныя структурныя элементы:

- 01. Тытульны ліст;
- 02. Тлумачальная запіска;
- 03. Вучэбныя праграмы па вучэбнай дысцыпліне;
- 04. Тэарэтычны раздзел;
- 05 Практычны раздзел;
- 06. Раздзел кантролю ведаў;
- 07 Дапаможны раздзел.

У раздзеле “Вучэбныя праграмы па вучэбнай дысцыпліне» ВМК (электронная версія) прадстаўлена вучэбная праграма, складзеная на аснове базавай праграмы “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, якая ўключае тлумачальную запіску, змест вучэбнага матэрыялу, вучэбна-метадычную карту дысцыпліны для дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі.

**Тэарэтычны раздзел** ВМК (электронная версія) ўключае матэрыялы для тэарэтычнага вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” па наступных раздзелах: “Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, “Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей”, “Лексічная сістэма беларускай мовы”, “Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму”, “Арфаграфія”, “Марфалагічная спецыфіка беларускай мовы. Граматычныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы”, “Функцыянальныя стылі мовы” і “Лексікаграфія”. У рэкамендуемай частцы прадстаўлены тэарэтычныя і практычныя матэрыялы па культуры прафесійнага маўлення. Тэарэтычныя звесткі па тэмах дазволяць актуалізаваць і паглыбіць веды пра гісторыю беларускай мовы, яе стылістычную дыферэнцыяцыю, сістэму нормаў літаратурнай мовы, атрымаць веды пра спецыяльную лексіку беларускай мовы, асноўныя паняцці культуры маўлення.

**Практычны раздзел** ВМК (электронная версія) змяшчае практыкаванні па кожнай тэме вучэбнай праграмы дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка), а таксама тэксты для аналізу па 34 відах спорту (Дадатак 1). Адны з іх разлічаны на паглыбленне тэарэтычных ведаў пра лексічныя, фанетычныя, арфаэпічныя, словаўтваральныя і граматычныя асаблівасці сучаснай беларускай літаратурнай мовы, іншыя звязаны з праблемамі моўнай сітуацыі, інтэрферэнцыяй. Заданні, прысвечаныя лексіцы прафесійнай сферы, даюць студэнтам магчымасць убачыць і зразумець спецыфіку фармальна-семантычных працэсаў, якія адбываюцца ў сістэме спартыўнай тэрміналогіі, усвядоміць асаблівасці словаўтварэння і перакладу тэрмінаў з рускай мовы на беларускую. Усе тэксты практыкаванняў змяшчаюць матэрыял на спартыўную тэматыку.

Розныя па характары і ступені цяжкасці практычныя заданні даюць магчымасць выкарыстоўваць матэрыял як пры групавым, так і пры індывідуальным навучанні. У залежнасці ад мэты, задач і характару работы, а таксама ад узроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі навучэнцаў, выкладчык можа

спрасціць некаторыя заданні ці ўскладніць іх, выкарыстоўваць матэрыял цалкам або выбарачна.

**Раздзел кантролю ведаў** ВМК (электронная версія) уключае пытанні і заданні да кожнай тэмы і тэсты да кожнага раздзелу, пытанні да заліку.

**У дапаможным раздзеле** пададзены ключы да некаторых практыкаванняў і тэстаў, указаны спіс рэкамендаванай і выкарыстанай літаратуры, а таксама слоўнікі, якія змяшчаюць беларускамоўную фізкультурна-спартыўную тэрміналогію.